ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 60 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 908.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 211 (1480) | ПЯТНІЦА, 11 верасьня 1931 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Летапіс жудасных фактаў сярэднявечнай інквізыцыі хаваюць змрочныя сьцены фашысцкіх турмаў

„...Разьюшаныя каты зьбівалі, калечылі і зьдзекваліся над галадаючымі... Кожнага зьняволенага выводзілі па адзіночцы і прымушалі на марозе купацца ў халоднай ваньне"...

СПЫНІЦЬ ЗЬДЗЕКІ!—патрабуюць працоўныя сьвету

Пролетарыят пераможа!

Адчуваючы свой канец, фашыстыя, пры актыўнай дапамозе соцыял і нацыянал-фашыстых праводзяць па ўсёй Польшчы, Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі жахлівы, барбарскі тэрор супроць тых, хто гэроічна змагаецца за сваё вызваленьне з пад нацыянальнага ўціску, хто змагаецца супроць беспрацоўя, падаткаў, усялякіх прымусовых законаў Пілсудзкага.

Турмы фашысцкае Польшчы перапоўнены політзьняволенымі, якіх ўжо на сёньнешні дзень налічваецца 10000. Дэфэнзіўны ўрад будуе новыя турмы, па новаму ўзору, гэта значыць—выключна з асобнымі камерамі „адзіночкамі". Гэтыя турмы будуюцца на далёкіх ускраінах, воддаль фабрычна-заводзкіх цэнтраў, каб перашкодзіць праяўленьню салідарнасьці працоўных. Гэтыя турмы будуюцца па апошняму слову новай турэмнай тэхнікі, з спэцыяльнымі прыстасаваньнямі для катаваньня політзьняволеных.

Па турмах усёй Польшчы фашысцкім законам Пілсудзкага ўводзіцца надзвычайны турэмны рэжым. Політзьняволеных ставяць у адны ўмовы з крымінальнымі, Сурова забараняюцца ўнутраныя турэмныя колектывы зьняволеных, агульныя бібліотэкі, абмен газэтамі, дапамога адзін аднаму сьнеданьнем і г. д.

Політзьняволеныя вядуць жорсткую барацьбу супроць увядзеньня гэтага жорсткага закону адбіваючы атакі разьюшанага фашызму.

У Лукішках у пачатку ліпеня гэтага году, турэмная адміністрацыя адабрала ў політзьняволеных бібліотэку (іх асабістую) у колькасьці 1000 кніг, прымусіла насіць турэмную адзежу, забараніла организоўваць колектывы політзьняволеных, атрымоўваць з волі газэты, літаратуру, харчовыя пасылкі, зьменшыла на поўгадзіны ў дзень прагулку і г. д.

У адказ на гэта 190 політзьняволеных аб'явілі галадоўку. Галадоўка працягвалася 10 дзён. Усе гэтыя дні разьюшаныя каты зьбівалі, калечылі і зьдзекваліся над галадаючымі, некалькі чалавек было зьбіта да страты прытомнасьці, іх прышлося „ўбраць" у турэмны шпіталь. Комсамолка Хася Цэйтэль спараліжавана. Пры сьмерці ляжыць у камэры політзьняволены Міцька.

У знак протэсту рабочыя шкляное гуты Шапіры і фабрыкі Новагрудзкага абявілі дзьвюх гадзінную забастоўку. Гэтай забастоўкай было ахоплена больш 750 рабочых. Турэмная адміністрацыя пад націскам політзьняволеных і рабочых прымушана была на дзесяты дзень забастоўкі пайсьці на ўступкі. Але калі політзьняволеныя забастоўку спынілі фашыстыя яшчэ больш узмацнілі турэмны рэжым, прыняўшы рад жорсткіх мер да галадаўшых;

У Пінскай турме становішча політзьняволеных жудаснае. Адняты ўсе правы, якімі яны карысталіся. Начальнік турмы, пан Колец, былы інспэктар турмы ў „Сьвентым кшыжу", з політзьняволенымі абыходзіцца нахабна груба. Калі пры яго ўваходзе ў камэру зьняволены ня ўстане ў позу „на бачнасьць", дык пачынаюцца зьверскія катаваньні.

Адміністрацыя турмы сьвята выконвае суровы турэмны рэжым. Усіх політзьняволеных перавялі з верхніх паверхаў уніз, дзе пануе цемра; вільгаць і холад. Кожнага політзьняволенага выводзілі па аднаму з камеры і прымушалі на марозе купацца ў халоднай ванне, потым стрыглі валасы, адзявалі прымусова ў турэмную адзежу і садзілі разам з крымінальнымі. Політзьняволеныя выступілі з протэстам, аб'явіўшы галадоўку. Галадоўка праз некалькі дзён скончылася перамогаю політзьняволеных.

Такое-ж становішча і ў Беластоцкім астрозе, дзе сядзіць 170 політзьняволеных. З іх большая палова хворых на сухоты, жалудачныя хваробы і рэўматызм, Порцыя хлеба зьменшана з 400 да 300 грам у дзень.

У фашысцкіх турмах уведзена так званая „сэгрэгацыя" гэта значыць падразьдзяленьне політзьняволеных на асобныя групы па нацыянальнасьці, узросту, адукацыі і паходжаньню.

Напрыклад палякаў садзяць асобна ад беларусаў і яўрэяў, інтэлігентаў—ад рабочых і сялян і г. д. Пілсудчыкі імкнуцца нацкаваць адну групу на другую.

Дзесяткі соцень жудасных неапісальных крывавых фактаў сярэднявяковай інквізыцыі хаваюць змрочныя сьцены фашысцкіх турам: уліваньне вады і мачы ў нос, штучнае кармленьне пры дапамозе жалезных трубак, лупцаваньне жалезнымі палкамі па пятках, выкручваньне касьцей рук і ног, гвалтаваньне жанчын і г. д.

Крывавыя каты на чале з панам Пілсудзкім парашылі фізычна і маральна зьнішчыць перадавыя атрады змагароў за свабоду.

Але гэта ім ня ўдасца. Пролетарыят верыць у сваю перамогу, і пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ ён пераможа.

Буйніцкі.

ДЭМОНСТРАЦЫЯ

магутнасьці рэволюцыйных сіл моладзі

МЮД, радзіўшыся, як дзень протэсту супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць мілітарызму, цяпер зьяўляецца днём мобілізацыі працоўных мас на барацьбу супроць дыктатуры буржуазіі, за абарону СССР, за дыктатуру пролетарыяту ва ўсім сьвеце.

У дзень 17 МЮД ва ўсім сьвеце ня гледзячы на поліцэйскія забароны, адбыліся дэмонстрацыі працоўнай моладзі сумесна з беспрацоўнымі.

Соцыял-фашысцкі жандар Бэрліна Гржэзінскі, крывавы Пільсудзкі, поліцэйскі прэфэкт Парыжу, усе яны імкнуліся забараніць дэмонстрацыю 17 МЮД. Выдалі спэцыяльны загад. Але забароны фашысцкіх жандараў не змаглі прымусіць рэволюцыйных працоўных у дзень 17 МЮД'у сядзець дома. КІМ дэмонстраваў сваю магутнасьць і адданасьць партыі Леніна.

—Хай забараняюць нас, хай закоўваюць у ланцугі,—нам належыць будучае.

І ў дзень 17 МЮД'у (ня гледзячы на забароны) выйшлі на вуліцы Бэрліну, Гамбургу, Штудгарду, Дусэльдорфа, Парыжу, Варшавы, Вільні, Мадрыду, Токіё, Будапэшту рэволюцыйныя калёны працоўнай моладзі пад кіраўніцтвам компартыі дэмонстраваць сваю магутнасьць.

3000 поліцэйскіх і жандараў „дэмократычнага" Парыжу і дзяжурэ поліцэйскі аэроплян, атакі Мадрыдзкай поліцыі на дэмонстрантаў, арышты ў Японіі, труп 9-ці гадовай дзяўчынкі ў Варшаве, забітай фашыстымі ў час дэмонстрацыі, жорсткія сутычкі ў Будапэшце, арышты ў Нямеччыне,—усё гэта не змагло прымусіць КІМ адмовіцца ад сьвяткаваньня 17 МЮД'у.

17 МЮД яшчэ шырэй адчыніў дзьверы сэкцыі КІМ'у для масавых рабочых папаўненьняў, яшчэ і яшчэ раз паказаў сілу комсамолу, сілу рэволюцыянізуючагася пролетарыяту.

—У провінцыі Пфальц, дзе былі забаронены мітынгі і дэмонстрацыі комсамолу ўдалося завербаваць 261 новых членаў і стварыць 8 новых мясцовых ячэек.

—У Рурскай вобласьці ў комсамол перайшло 12 соцыял-дэмократаў, 21 былых нацыянал-соцыялістых і 13 каталіцкіх маладых рабочых.

Ня толькі ў Нямеччыне, але ва ўсім сьвеце комсамол праслае ў глыбачэйшыя нізы пролетарскае моладзі, мобілізоўвае яе на барацьбу супроць дыктатуры фашызму, за сусьветны Кастрычнік. 17 МЮД мобілізоўваў сотні тысяч рабочае моладзі пад сьцягі КІМу МЮД нанясе непапраўны ўдар соцыял-фашыстым, паскорыў развал у іх радох.


17 МЮД—паваротны пункт для яшчэ большага разгортваньня работы па вярбоўцы ў комсамол, барацьбы за масы, за ператварэньне комсамолу ў шматмільённую організацыю.

МЮД паказаў адданасьць комсамолу комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам якое комсамол праводзіць барацьбу за масы, за абарону СССР ад імпэрыялістычных нападаў, за Савецкі сьвет. У СССР МЮД прайшоў пад знакам ажыцьцяўленьня 6-ці задач, пастаўленых правадыром ленінскай партыі—Сталіным.

МЮД у СССР і за савецкім рубяжом паказаў рэволюцыйны ўздым рабочае моладзі, паказаў сілу, згуртаванасьць, клясавую дысцыплінуванасьць і ўпэўненасьць у перамогу рэволюцыі, паказаў бражэньне, няўпэўненасьць і распад у лагеры імпэрыялізму.



У мюдаўскія дні.



Рабочая дэмонстрацыя ў Амэрыцы

Працоўныя протэстуюць супроць зьдзекаў фашысцкіх катаў

Віцебск. (Белта). Рабочыя майстэрні і затоку віцебскай прыстані ў адказ на разгул белага тэрору ў турмах Польшчы павышаюць тэмпы выкананьня промфінпляну і адлічваюць 1 проц. месячнага заработку ў карысьць політзьняволеных і іх сем'яў.

* * *

Мы, прадстаўнікі колгасьнікаў Бабруйшчыны, рашуча протэстуем супроць нячуваных зьдзекаў над лепшымі барацьбітамі—рэволюцыянэрамі, якія кінуты за краты фашысцкіх астрогаў Польшчы.

Колгасьнікі шлюць сваё гарачае прывітаньне політзьняволеным польскіх турмаў. На тэрор фашызму мы адкажам узмацненьнем колгаснага будаўніцтва. Абавязваемся разгарнуць па колгасах збор сродкаў у фонд зімовай дапамогі політзьняволеным.

Чылі ў агні паўстаньняў

НЬЮ-ЁРК, 7. Як паведамляе аг. „Асошыэйтэд прэс", чылійскі ўрад абвясьціў, што пасьля паветранай бамбардыроўкі ў парту Кокімбо, куды флёт зьвярнуўся пасьля непрацяглага рэйсу, захоплена 5 зьнішчальнікаў і 2 падводныя лодкі. Больш буйныя ваенныя караблі не здаліся. Паўстанцы зьбілі адзін аэроплян.

Чылійскі ўрад пацьвярджае, што ўрадавымі войскамі захоплен крэйсэр у парту Талькахуана. „Нью-Ёрк таймс" у сувязі з гэтым паведамляе, што пры атацы на форты Талькахуана забіта і паранена ня менш 300 салдат урадавых войск.

У выніку абвяшчэньня забастоўкі на чыгунцы Сант—Яго—Вальпарайзо, чылійскі ўрад прабуе перадаць усю чыгунку пад кіраўніцтва армейскіх офіцэраў для перавозкі войск. Баючыся далейшых выступленьняў рабочых, ўрад трымае тысячы беспрацоўных на паўтурэмным становішчы ў асобных раёнах пад аховаю войск. Суровая цэнзура працягваецца. Антыўрадавыя газэты закрыты.

Міжнародная хроніка

* Абанкруціўся бэрлінскі „Банк тэкстыльнай фабрыкі". Гэты банк карыстаўся вялікім давер'ем і фінансаваў прадпрыемствы тэкстыльнай, цэлюлёзнай і папяровай прамысловасьці.

* Харбінская кітайская газэта „Дунхуна-бао" паведамляе, што ў выніку нерашучых захадаў кітайскіх улад, рускія белагвардзейскія атрады працягваюць існаваць на КВЖД і праяўляюць вялікую актыўнасьць.

* Былы бэльгійскі прэм'ер і старшыня міжнароднай конфэрэнцыі, якая адбылася ў Жэнэве ў маі 1927 г. Тэніс, прапаведвае экономічную вайну супроць СССР.

Мільён загінуўшых ад паводкі

ШАНХАЙ, 7. У Шанхаі лічаць, што лічба ахвяр паводкі, якім неабходна безадкладная дапамога, дасягае 180 мільёнаў. Ад паводкі пацярпела 300 паветаў ў 17 провінцыях. Найбольш пацярпелі провінцыі Хубэй, Аньхуэй і Цзянсу. Становішча ў Хубэі за апошнія дні яшчэ больш пагоршылася ў зьвязку з тым, што вада ў Вялікім канале зноў паднялася, і многія гарады, зьмешчаныя ўздоўж канала зноў аказаліся пад пагрозай.

Па паведамленьнях з поўначы, разьліў ракі Жоўтай зрабіў яшчэ горшыя разбурэньні, чым разьліў Янцзы. Рэйтэр лічыць, што ў басэйне ракі Жоўтай у выніку паводкі загінула 1 мільён чалавек. Нанкінскі ўрад ў дапамогу пацярпеўшым парашыў выпусьціць пазыку толькі ў 30 млн. доляраў замест меркаваных 80 млн.

Яшчэ 50000 асуджаных на галодную сьмерць

Форд, славуты аўтамабільны кароль ва ўсім сьвеце, лічыцца найвялікшым буржуазным экономістам, а нядаўна зрабіўся і славутым „соцыялістым" за нібыта практычнае падвышэньне жыцьцёвага ўзроўню сваіх рабочых, бо пачаў выплачваць ім больш высокую пэнсію ў параўнаньні з іншымі прадпрыемствамі краіны.

Але цяпер ён набывае новую славу як непараўнальны дэмагог, якім ён заўсёды быў. Форд абвясьціў у газэтах, што ён пашырае свае прадпрыемствы. Гэта прыцягнула ў Дэтройт з іншых гарадоў дзесяткі тысяч рабочых, якія шукалі працы. Форд дасягнуў свае мэты: ён звольніў усіх рабочых, якія атрымлівалі больш высокую пэнсію і на іх месца наняў новых, якім плаціў па 6 доляраў у дзень. Потым ён зьняніў амаль у тры разы колькасьць рабочых, увёў новыя машыны, скараціў работу да трох дзён у тыдзень, а ў некаторых аддзелах да аднаго дня ў тыдзень. Ня гледзячы на гэта ў мінулым месяцы яго фабрыкі выпусьцілі 100000 аўтамабіляў.

Форд звольніў звыш 50000 рабочых, якія асуджаны на галодную сьмерць. А ў той самы час ён апублікаваў, што яго чысты прыбытак за 1930 г. складае 44460932 доляры. Але ён гэтым „нездаволены", бо ў 1930 г. ён меў прыбытак у 81797861 дол.

В. Марч

Так званыя „соцыялістыя"—за зьніжэньне зарплаты

Па апошняму загаду ўраду Брунінга пэнсія служачым дзяржаўных устаноў зьменшана на 4-7 проц. Вядома, што у першую чаргу зьменшана пэнсія самых ніжэйшых служачых—беднаты. Напрыклад я — звычайны. радавы паштовы служачы—працую ў месяц усяго 60 гадзін і за гэта маю 50 марак. З гэтай сумы я павінен плаціць 3 маркі ў бальнічную касу.

Ня гледзячы на тое, што 50 марак пэнсія сама па сабе вельмі малая, урад у красавіку зьменшыў яе на 5 проц.—на 2 з пал. маркі. У ліпені зноў прайшло зьніжэньне на 4 проц.

Такім чынам, замест 50 марак я маю зараз толькі 42 з пал. маркі ў месяц. Акрамя усяго, я павінен плаціць у год падаходнага падатку 9 марак. Але я належу да „шчасьліўцаў", бо маю працу.

Радавыя ніжэйшыя служачыя ўсіх устаноў перажываюць зьніжэньне зарплаты. Але яно не закранула тых, хто атрымлівае вялікую пэнсыю. Рэформісцкія профсаюзы ў сваёй програме маюць пункт аб тым, што яны будуць змагацца з усякім пагоршаньнем у становішчы служачых—членаў саюзу. Аднак, на справе яны займаюцца ня гэтым. Яны даюць парады як правесьці добра адпачынак і як лепш змагацца з чырвонай профсаюзнай опозыцыяй, якая сапраўды зьяўляецца вернай абаронцаю праў працоўных, бо толькі яна паўстала супроць зьмяншэньня зарплаты, а так званыя соцыялістыя моўчкі абышлі гэта. У гэты час яны займаліся „больш неабходнай" для пролетарыя справай — яны склалі прыкладную програму для рабочых пікнікаў!

Куль.

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕГЕМОНІЮ!

Яўрэйская пролетарская літаратура, дзякуючы братэрскаму супрацоўніцтву з літаратурамі працоўных іншых нацыянальнасьцяй СССР, прыходзіць да ўсесаюзнай нарады яўрэйскіх пролетарскіх пісьменьнікаў з вялізарнымі перамогамі. Яшчэ шырэй разгортваць заклік ударнікаў у літаратуру, весьці бязьлітасную барацьбу супроць усялякіх варожых марксызму-ленінізму ідэолёгій у літаратуры, вышэй узьнімаць сьцяг барацьбы за вялікае мастацтва бальшавізму—такія асноўныя задачы яўрэйскай пролетарскай літаратуры. У вырашэньні гэтых задач комсамол павінен аказаць вялікую дапамогу

А. Юдэльсон

НЕГАРЭЛАЕ

(Урывак з поэмы)



Цябе, прымежны пункт, дагэтуль я ня знаў—
І сэнсу тваёй назвы не згадаць адразу,
Кажуць, шмат разоў ты ў полымі палаў,
Дык хтосьці жартам даў табе такую назву.
—Негарэлае—
—Не палыхаў агонь—
Не пасуе табе назва гэта,—
Першае вітаньне пурпурных сьцягоў
Пурпурны парог ад Польшчы да Саветаў...
Негарэлае!
Непалены пояс—
Ня прыметы ў назьве я шукаю.
Дык чаму
Зноў злосьцю грае кроў...
Дык чаму
Зноў тут успомніў я
Сьцены цьвёрдыя,
Бяздушныя, што камень...
І сяброў,
Замораных сяброў,
З палкімі, бліскучымі вачымі,
Пад жалезнымі замкамі...
Ах, чаму
Ты правяла мяжу
Па зямлі,
Як вострымі нажамі...
Негарэлае!
Чырвона-чорны пас—
Прымежны слуп зямлі,
Што ўпчэ не палыхала,
Можа тваё імя—
То прарочы сказ
Для тых,
Хто яшчэ твой сьцяг не калыхалі..
А магчыма
Як тут адгадаць—
Ты—загад
Для ведругаў і другаў..
Можа і ня жартам
Хтосьці назву даў...
Можа і ня жартам
Хтось прыдумаў...
—Негарэлае.

З яўрэйскае мовы пераклаў
Ізраіль Плаўнік

За вялікае мастацтва бальшавізму

Х. ДУНЕЦ

У бліжэйшы час адбудзецца 1-ая ўсесаюзная нарада яўрэйскіх пролетарскіх пісьменьнікаў СССР. З якімі-жа вынікамі яўрэйская пролетарская літаратура прыходзіць да гэтае нарады.

Годы соцрэконструкцыі, годы наступу соцыялізму па ўсяму фронту атрымалі сваё адлюстраваньне ў галіне культурнай рэволюцыі і павінны былі няміначча адбіцца на росьце соцыялістычнай па свайму зьместу культуры працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР. Бурнае культурнае будаўніцтва, разгорнутая работа ва ўсіх галінах мастацтва—такава характэрная рыса разьвіцьця яўрэйскай пролетарскай культуры і ў прыватнасьці—яўрэйскай пролетарскай літаратуры.

Барацьба за пролетарскі і соцыялістычны зьмест яўрэйкай літаратуры разьвівалася пры шалёным супраціўленьні буржуазных, нацыяналістычных і опортуністычных элемэнтаў, якія аказалі ўплыў на пэўныя часткі яўрэйскай савецкай інтэлегенцыі, у тым ліку-пісьменьніцтва. Гэтыя элемэнты асабліва імкнуліся замацаваць старыя формы і стары зьмест, чужды пролетарыяту, у яўрэйскай літаратуры і ў мастацтве.

Пролетарская літаратура з посьпехам змагалася супроць чужых пролетарыяту плыняў. Апошні пэрыод характарызуецца вялікім ростам яўрэйскай пролетарскай літаратуры, як у галіне зьместу і тэматыкі, так і ў галіне абагачэньня форм, якаснага росту. Адыходзіць на задні плян старая местачковая тэматыка, нацыянальна-абмежаваная сфэра яўрэйскага жыцьця, традыцыйная галерэя тыпаў з асяродзьдзя яўрэйскай дробнай буржуазіі. Перамагаецца ўпадніцкі і нацыяналістычны дух у яўрэйскай літаратуры.

Апошнія годы далі цэлы рад твораў яўрэйскай пролетарскай літаратуры, адлюстроўваючай працэсы соцбудаўніцтва нашай краіны і ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі ў асяродзьдзі яўрэйскіх працоўных. Да твораў такога роду патрэбна аднесьці зьявіўшыяся за апошні год кнігі пісьменьнікаў Альбертона, Абчука, Орланда, Рабіна, Персава, „поэта"—Харыка, Фэфэра, Юдэльсона, Маркіша і цэлага раду іншых.

Рост яўрэйскай пролетарскай літаратуры характарызуецца таксама тым, што за апошні пэрыод стаў прыкметна праяўляць сябе рабочы-ударнік, заклікаў у літаратуру. Гэта асабліва трэба падкрэсьліць у тым комсамольскім друку, нескольку рабочых-ударнікаў у літаратуру ў значнай частцы сваёй творчасьці прысьвячаюць тэме комсамолу і моладзі. Ш. Гарэлік, Дзехіяр, Каплан, Шведзік, Пінхасік (работніца), Дзінерман, Райзман і цэлы рад іншых ударнікаў—яны ў асноўным прыйшлі ў яўсэкцыю БелАПП'у з радоў комсамолу.


Гэта даказвае, што комсамол зьяўляецца вялікай комуністычнай школай і для нашых пролетарскіх кадраў літаратуры і мастацтва.

Аднак належыць тут-жа адзначыць, што не заўсёды з боку асобных організацый удзяляецца дастатковая ўвага гэтай надзвычайна важнай справе на даным этапе разгортваньня культурнай рэволюцыі.

Разам з тым, трэба адзначыць, што ў яўрэйскай пролетарскай літаратуры жыцьцё комсамолу, тэматыка моладзевага жыцьця, пытаньні бытавых умоў моладзі і г. д. атрымалі яшчэ слабое адлюстраваньне. Можна ўказаць на творы Рабіна, у некаторай частцы—Элі Кагана і іншых, закранаючых цэлы рад проблем. Але гэта зусім мала. Заклік рабочых-ударнікаў павінен запоўніць і гэты прабел, ахапіўшы нашу літаратуру да работы над комсамольскай тэматыкай.

Далейшае разгортваньне яўрэйскай пролетарскай літаратуры патрабуе вышэйшай масавасьці ўсяго руху, прыцягненьня шырокай пролетарскай грамадзкасьці да пытаньняў яўрэйскай пролетарскай літаратуры, выхаваньня адарваных пісьменьнікаў ад вытворчых задач і палітычна-гаспадарчых кампаній партыі і Савецкай улады.

Яўрэйская секцыя БелАПП за апошні пэрыод разгарнула вялікую работу ў суадносінах з гэтай задачай. Організаван рад літгурткоў па прадпрыемствах. Праводзяцца масавыя сходы рабочых і колгасьнікаў па пытаньнях літаратуры. Але тут работу трэба яшчэ больш разгарнуць. Трэба ... такое становішча, каб



Літгурток друкарні імя Сталіна. Сакратар гуртка т. Кацовіч чытае свой твор

яўрэйскі пролетарскі пісьменьнік быў органічна зьвязаны з соцыялістычным будаўніцтвам, жыцьцём партыі і комсамолу.

Яўрэйская пролетарская літаратура, як неадрыўная частка пролетарскай літаратуры ўсёй краіны, творчы ў нацыянальнай форме, павінна даць вялікае мастацтва бальшавізму. Гэта азначае, што яўрэйскія пролетарскія пісьменьнікі павінны сваім мастацкім словам, сваімі вобразамі ўключыцца ў барацьбу за соцыялізм, у барацьбу з рэштакамі капіталізму. Гэта азначае, што пісьменьнік павінен быць не назіральнікам нашага жыцьця, а яго актыўным удзельнікам, будаўніком соцыялізму.

Гэта абавязвае пісьменьніка праякнуцца ідэямі бальшавізму, ідэямі Леніна, дыялектычным разуменьнем разьвіцьця грамадзкага жыцьця і клясавай барацьбы, выразным разуменьнем сёньняшняга і заўтрашняга дня.

На аснове марксызма-ленінізма яўрэйскі пролетарскі пісьменьнік павінен выпрацаваць свае мэтады і прыёмы, неабходныя для таго, каб даць высока-якасную, поўнацэнную мастацкую продукцыю. Як наогул у літаратуры, мы і ў яўрэйскай літаратуры маем зьявы прыстасаваньня і „чырвонай халтуры", г. зн. калі людзі, ўладаючы тэхнікай слова, падрабляюцца пад пролетарскі лад, маючы старонкі комуністаў і ўдарнікаў, божацца аддана савуладзе і комунізму, а на справе ў іх творах нічога ні калыя пролетарскай праўды.

З гэтымі зьявамі нам трэба бязьлітасна змагацца. Трэба таксама разгарнуць шырокую крытыку, разбор твораў нашых маладых ударнікаў з тым, каб паказаць на колектыўным матар'яле, што новага і добрага прыносіць у літаратуру рабочы-ударнік і разам з гэтым растумачыць на жывых матар'ялах, як пісьменьніку трэба працаваць і яго не спыніць.

Марксыцка-ленінская крытыка павінна сконцэнтраваць сваю ўвагу галоўным чынам на актуальных задачах дня, на конкрэтных творах літаратуры, аднакасова змагаючыся за марксыцка-ленінскую мэтодолёгію ў літаратуразнаўстве, у навукова-даследчай працы і г. д.

Прадстаячая ўсесаюзная нарада яўрэйскіх пролет. пісьменьнікаў павінна будзе сказаць сваё рашучае слова ў пытаньнях барацьбы з рэштамі нацменшавіцкіх і опортуністычных поглядаў на яўрэйскую літаратуру. Трэба будзе ўскрыць, канчаткова выкрыць і разграміць гэтыя погляды, маючыя месца ў рабоце т. т. Літвакова, Нусінава і інш. „літаратуразнаўцаў" і „крытыкаў", ставячых справу „нацыянальнай культуры" ўне сувязі з клясавымі задачамі пролетарыяту, недацэньваючых пролетарскую літаратуру і задачу яе бальшавізацыі.

Толькі ў барацьбе з усялякімі ўхіламі, правымі, „левымі", меншавіцкімі і нацыяналістычнымі, яўрэйская пролетарская літаратура можа пасьпяхова рухацца наперад у справе зьдзейсьненьня лёзунгу „за вялікае мастацтва бальшавізму". Комсамол павінен дапамагчы ў гэтай справе!

Ізі Харык

УРЫЎКІ З ПОЭМЫ „МЕНСКІЯ БАЛОТЫ"

(З часткі другой)



17.
І выслаў Менск цягнік з гарачымі хлапцамі,
Між імі Піня полымем гарэў...
Ніхто ім ураньцы не махаў рукамі,
І не бадзёры гучны марш ці сьпеў.
А неспакой на фронце, ой, вялікі,
Над Менскам неба можна рассячы.
А калі трэба—дык бяз енку, крыку,
Грудзі і галовы—пад мячы...

. . . .

19.
Не касматыя асілкі, ня героі,
Зубы сьцяўшы, мысьляць пра сябе..
Маладая моладзь прызамоўчным строем
Змораны калышацца ў сядле.
Якая ціш... А ноч акушона летам,
Сасной і нівам, пахам і смалой...
Хто знае, можа сьмерць у лесе гэтым...
Варшава—далы... Эх, браце мой!
Засьпяваем, хай нарушыцца ціш!..
Якая ціш... Спускаецца цяжар...
Гарэзны сьвіст і крык, пакроў бражджэньня
Пужаюць даль, гуляюць шляхам жар...
Гэй, хай пачуе, хай прычмыцца вораг
І мерыцца штыхом аб штых...
А ноч—агонь, трывога і ноч гаворыць
Трывога рвецца з воч, грудзей, як рык.

. . . .

21.
У лясох беларускіх са смольнымі гольлямі
Хто будзе на варце адно?..
— Сягоньня, як сэрцы абіймуцца з полымем,
— Сягоньня—у змрочную ноч...
Ціха, спакойна, напруджваясьць і змораныясьць..
Каму бараніць цішыню?..
З вамі сягоньня—на ты—загавораць
Строі вятроў і агню...
Хто сёньня спаткнецца,—на стрэльбу тэй схіле,
Свой голаў—загаслы прамень..
Ціхія, пыльныя, вулкі глухія,
Хата, крывавы наш Менск..
Менск, 1924 год.

З яўрэйскай мовы пераклаў
Ізраіль Плаўнік

„Наш ансамбль"

Беларускі Дзяржаўны Ансамбль народных інструмэнтаў малады і па ўзросту сваіх працаўнікоў і па гадох іенаваньня.

Выпускнікі музтэхнікуму, спэцыялісты гэтай справы, на чале з вядомымі музыкамі, як Захер, Навіцкі, Жыдовіч і вядомая працоўным БССР сьпявачка Александроўская арганізаваліся ў колектыў, які дзякуючы сваёй актыўнай працы быў абвешчан у 1930 годзе дзяржаўным ансамблем. У склад ансамблю ўваходзяць студэнты музтэхнікуму і рабочыя ад варштату.

Ансамбль сваім непасрэдным абавязкам паставіў задачу мастацкага абслугоўваньня концэртамі і культвылазкамі ў парадку шэфства працоўных БССР і іншых частках Савецкага Саюзу (Масква, Харкаў, Донбас і г. д.).

Улетку гэтага году ансамбль быў накіраваны для працы на Гомельскаму, Рэчыцкаму, Мозырскаму і інш. раёнах, дзе быў дадзены рад канцэртаў на фабрыках і заводах (Гомсельмаш, зав. імя Ланцуцкага, фабрыка „Везувій", чыгуначнікі і інш.).



На фото: выступленьне ансамблю на гомельскім заводзе імя Ланцуцкага.
У овале: кіраўнік ансамблю тав. Жыдовіч.

Пасьля гэтага ансамбль выехаў на Украіну, дзе працаваў на заводах, фабрыках, даючы канцэрты ў клубах і ў часе абедзенных перапынкаў.

Ансамбль даў шмат канцэртаў, добчы высланы на шахты Донбасу, дзе было абслужана канцэртамі каля 10 ... шахцёраў.

Ансамбль пабываў у Харкаве, дзе даваліся канцэрты для рабочых Харкаўскага Трактарбуду, у Луганску для рабочых Луганьску, у Алчэўску на канальні № 10 і раду іншых месц УССР. Было дадзена за 40 дзён 45 концэртаў, якімі было абслужана 30.000 чал. Акрамя гэтага было зроблена 11 культвылазак.

Ансамбль атрымаў цэлы рад адрасоў і прывітальных лістоў ад працоўных БССР і УССР. Ад шахцёраў Алчэўскага рабкоў ансамбль атрымаў падарунак—лямпу шахцёра.

Рабочыя Харкаўскага Трактарнага заводу ў сваім прывітальным пісьме, дзе гэта „наш ансамбль" і прасілі працаўнікоў ансамбля заявіць працоўным БССР, што трактарны завод будзе пушчаны ў прызначаны партыяй—1-га кастрычніка г. г. Ва ўсіх адрасох і прывітаньнях падкрэсьліваўся вялікі ўздым культуры БССР.

Усе водзывы зазначаюць на значную мастацкую каштоўнасьць ансамблю, які дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву і пры актыўным удзеле ўсяго колектыву працаўнікоў, змог дабіцца таго, што ансамблем на простых музычных інструмантах (цымбалы, лера, дудка і інш.) выконваюцца ня толькі музычныя нумары з народных і рэволюцыйных бадзёрых сьпеваў, але і высокая мастацкая клясычная музыка (Шуберта, Моцарта і інш.)

Пасьля адпачынку ансамбль накіроўваецца для абслугоўваньня колгасаў і рабочых цэнтраў БССР.

Эд. Галубок

Сталінцы за работай

Яўрэйскі літгурток ударнікаў друкарні імя Сталіна адзін з лепшых у МенАППе. Літгурток яднае 38 ударнікаў. З кожным днём ён расьце. Пачаў сваю працу з 5 асобамі. З 38 рабочых усяго ўдарнікаў-комсамольцаў 5 асоб—гэта недастаткова.

Заклік ударнікаў ня быў падхоплены парткалектывам, комсамольскім колектывам і ФЗК. Дзякуючы вялікай зацікаўленасьці ўдарнікаў літаратурай, мы усё-ж разгарнулі вялікую работу.

У нашай шматтыражцы выдадзена ўжо 2 старонкі „Літгурток у барацьбе за промфінплян". Таксама гэтымі днямі выходзіць спэцыяльная старонка ў „Акцябры". Былі выпадкі, што рэдколегія адмаўлялася даць месца ў газэце.

Мы рыхтуем зборнік твораў нашых літгуртакоўцаў. Гэты зборнік будзе выдадзены да ўсесаюзнае нарады яўрэйскіх пролетарскіх пісьменьнікаў.

Нашы гуртакоўцы вырашылі неабходным організаваць літгурток на фабрыцы „Кастрычнік" і ўзяць на грамадзкі буксір літгурток абутковай фабрыкі.

Вось у кароткіх рысах праца літцэху друкарні Сталіна.

Сябр літцэха Ідэльчык Я.

Пасеўработу—на бесьперапынны ход

Змагацца за максымальнае скарачэньне тэрмінаў асеньняга севу

Асеньняму—ударныя тэмпы

Асеньні сеў увашоў у паласу найбольшага напружаньня.

Аўладаньне тэмпамі асеньняй сяўбы немагчыма бяз чоткай організацыі ўсіх колгасных работ. Правядзеньне асеньняга севу будзе праходзіць аднвчасова з цэлым радам іншых неадкладных работ—зяблівае ворыва, уборка позьніх яравых і тэхнічных культур, абмалот, хлебазагатоўкі. Адсюль ясна ўся напружанасьць работ, вострая неабходнасьць іх чоткай увязкі.

Зусім недапушчальна прыпыненьне і затрымка якіх-небудзь процэсаў. Опортуністычнай тэорыі „чарговасьці" сельска-гаспадарчых кампаній павінна быць супроцьпастаўлена дакладнае пляніраваньне.

Роля комсамольскіх ячэек і колектываў саўгасаў, колгасаў і МТС у організацыі правільнага пляніраваньня ўсіх работ па севу, узьмёту зябі, уборцы і хлебазагатоўках—вялікая.

У рабочым пляне кожнага колгасу патрэбна зусім выразна вызначыць каляндарныя тэрміны севу і зяблівага ворыва, патрэбную колькасьць інвэнтара, рабочай і цягавай сілы, разьмеркаваць правільна іх па брыгадах. Кожнай брыгадзе павінна быць дадзена цьвёрдае заданьне як па плошчы, так і па відах работ і тэрмінах іх правядзеньня. На ўвесь час работы за брыгадамі абавязкова павінны быць замацаваны вучасткі, цягавая сіла і інвэнтар.

Унутры брыгады на час работ інвэнтар і цягавая сіла замацоўваюцца за паасобнымі колгасьнікамі.

У нашых колгасах накапіўся ўжо дастатковы вопыт у зьдзельшчыне і вучоце. У процэсе асеньня-васеньніх работ трэба дабіцца палепшаньня і пашырэньня зьдзельшчыны і вучоту. Гэта будзе спрыяць вялікаму росту вытворчасьці колгаснае працы.

Забясьпечанасьць колгасаў насеньнем—ня менш важная справа. Ячэйка павінна дабіцца таго, каб усё насеньне, сабранае ў гэтым годзе з лепшых насенных вучасткаў, цалкам было ачышчана і пратручана. Вучасткі павінны быць загадзя забясьпечаны завозам неабходнай колькасьці насеньня.

Дабіцца поўнага выкарыстаньня цягавай сілы: узорнай работы трактарных колёў, організацыі жывой цягавай сілы, выкарыстаньня колгаснага каня. Трэба выкарыстаць вопыт шэфства над колгасным канём. Сваячасовы і пільны догляд за канём дапаможа забясьпечыць бесьперабойны ход асеньніх пасеўных работ.

Па-баявому ў атаку за асеньні сеў, організацыйна-гаспадарчае замацаваньне колгасаў і далейшы рост колектывізацыі!



Колгас „Энэргія" закончыў сяўбу

Колгас „Энэргія", Рудзенскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, ударным парадкам, раней вызначанага тэрміну закончыў асеньнюю сяўбу, выканаўшы плян на 100 проц.

Зараз колгас пераключыцца на дапамогу адстаючым, узняўшы ў колгасе „10-годзьдзя БССР" тры га цаліны.

Рыг. Малаток.

Случчына зацягвае асеньні сеў

Разгортваньне асеньняй пасеўкампаніі па аднаасобным сектары Слуцкага р-ну праходзіць надзвычай марудна.

Цэлы рад сельсаветаў, недацэньваючы значэньня аднаасобнага сектару, не правялі масава-растлумачальнай работы, не мабілізавалі аднаасобнікаў на разгортваньне і заканчэньне ў тэрмін асеньняга севу.

Да гэтага часу сельсаветы яшчэ не маюць складзенага пляну па севу, не вызначаны цьвёрдыя заданьні па плошчы пад пасеў для кулацка-заможных гаспадарак.

У шмат якіх сельсаветах спазьніліся з вызначэньнем плошчы пад азімы клін, у выніку—глеба своечасова не падрыхтавана к пасеву. Ачысткай і пратручваньнем насеньня не займаюцца.

Злоснымі прарыўшчыкамі асеньняга севу зьяўляюцца: Ленінскі, Ганна-Агародніцкі і Чарнаўскі сельсаветы. У Ленінскім сельсавеце аднаасобнікі яшчэ не пачыналі сеяць і не падрыхтавалі глебу. Сельсаветы, партыйна-комсамольскія організацыі і райвыканкомы павінны неадкладна ўзяцца за асеньні сеў і зараз-жа выправіць прарывы.

Пост „ЧЗ" Ковіч Ж. і Пратасевіч М.

У поўнай гатоўнасьці

Колгас імя Бойкава Зубоўскага сельсавету (былога Копыскага р-ну) да сяўбы гатоў. Колгасьнікі, скончыўшы ўборку жыта, па-ўдарнаму ўзяліся за падрыхтоўку глебы пад азімы сеў і праз некалькі дзён падрыхтавалі 36 га.

1-га верасьня дружнымі шэрагамі колгасьнікі распачалі асеньні сеў.

М.

Датэрмінова скончылі сяўбу

Пухавічы 9. (Па тэлефону). Нова-організаваны колгас „Чырвоныя сацыялісты" Рудзенскага сельсавету на адзін дзень раней вызначанага тэрміну скончыў асеньнюю сяўбу.

Рыг. Малаток

Адсутнасьць правільнай організацыі працы зацягвае сеў

Згодна раённага пляну, усе колгасы Старадарожскага раёну павінны былі пачаць асеньнюю сяўбу 20 жніўня і закончыць 7 верасьня. Але для колгасу „Варашылава" Пасецкага сельсавету гэты тэрмін аказаўся не абавязковым. Колгас Варашылава зусім не падрыхтаваўся да сяўбы. На 5-е верасьня яшчэ не падрыхтавана ніводнага кілёграма насеньня. Колгасьнікі насеньне яшчэ не абагулілі.

Плошчу пад пасеў толькі к 3-му верасьня аслабанілі з-пад аўса, глеба для пасеву яшчэ не падрыхтавана.

Адважны.

Узьняць тэмпы асеньняга севу

Даўно мінаў тэрмін скончэньня ўборкі яравых культур—25 жніўня. Аднак, на Смалявіцкім раёне убрана толькі 3867 га, што складае 54,1 проц. Асабліва адстае уборка аўса. Убрана усяго 14,6 проц.

Асеньні сеў павінен скончыцца 30 жніўня. Між тым на 25 жніўня засеяна усяго 185 га. Факты недапушчальна марудных тэмпаў па уборцы яравых і правядзеньні асеньняга севу гавораць аб тым, што сьмецьце ў радах комсамольскіх ячэек і сельсаветаў раёну яшчэ не выжыты.

У тых колгасах і сельсаветах, дзе ўведзена прогрэсыўная зьдзельшчына, дзе наладжаны правільны ўлік працы, дзе асеньняя сяўба праводзіцца з колгасным прыкладам і ўся праца падпарадкавана соцыялістычным метадам,—там уборка скончана датэрмінова і сеў праходзіць здавальняюча. Так, напрыклад, колгас „Чырвоназарнец" скончыў уборку жыта і прыступіў да пасеву паняраднай апрацоўкі. Колгас „Сталінец" 21 жніўня скончыў ўборку пшаніцы. Колгас „Чырвоны штандар" за час асеньне-вясеннай уборачнай вырас на 32 гаспадаркі.

Усе сілы партыйна-комсамольскіх ячэек, уся грамадзкасьць павінны быць мобілізаваны на тое, каб падцягнуць тэмпы ўборкі яравых і як найхутчэй скончыць асеньнюю сяўбу.

Жваёвы.

Узброіць навічкоў марксысцка-ленінскімі ведамі

Дабіцца сапраўднага контакту паміж тэорыяй і практыкай

Ня глядзячы на адтэрмінаваньне, у правядзеньні політмінімуму яшчэ і дагэтуль пералому не дабіліся.

Політмінімум у першую чаргу павінен адыграць адну з рашаючых роляў у справе замацаваньня навічкоў. Гэтага аднак, не зразумелі кіраўнікі паасобных організацый. Аб гэтым яскрава сьведчыць зьмешчаны сёньня матар'ял. Ахапіць усіх навічкоў політмінімумам, падпарадкаваць політвучобу справе росту організацыі шляхам уцягненьня масы рабочай, батрацка-колгаснай моладзі ў гурткі, увязаць усю гэту вучобу з выкананьнем політычна-гаспадарчых задач—неадкладная задача ўсіх організацый.

Вучыцца ў плешчаніцкай комсамоліі

Плешчаніцкая раённая комсамольская організацыя па-баявому паладзіла політвучобу і можа служыць прыкладам у тым, як трэба выконваць баявыя задачы.

З 40 ячэек раёну 37 займаюцца політвучобай. У кожнай ячэйцы па два політгурткі: для малапісьменных і зусім політняпісьменных. Політвучоба непасрэдна перанесена ў брыгаду і праводзіцца рэгулярна. У гурткі ўцягнута значная частка колгаснае моладзі і дарослых колгасьнікаў.

Распрацаваўшы пэўную тэму, гурток выконвае тую ці іншую практычную работу. Асаблівая ўвага гурткоў была накіравана на ўдзел у пасьпяховым скапчэньні ўборачнай кампаніі і правядзеньні асеньняй пасеўнай. Гурткі зьяўляліся аднвчасова ўдарнымі брыгадамі ва ўсёй рабоце колгасаў. Амаль усе гурткі дабіліся ўвядзеньня сапраўднай зьдзельшчыны ў колгасах. Добра наладжаная ўвязка політвучобы з выкананьнем канкрэтных задач зрабіла тое, што політвучоба стала адным з лепшых дапаможнікаў ячэйкі ў выкананьні політычна-гаспадарчых задач.

Асаблівая ўвага была зьвернута на ахоп політвучобай навічкоў, як на адзін з сродкаў замацаваньня іх. Усе навічкі ахоплены гурткамі, дзякуючы гэтаму, мы ўжо зараз маем значныя дасягненьні ў падняцьці політузроўню навічкоў.

Для прапрацоўкі і праверкі політмінімуму наладжваюцца паміж ячэйкамі політбаі.

Плешчаніцкая організацыя выклікае на політбой па політмінімуму Лагойскую організацыю. Зараз па ячэйках разгорнута баявая падрыхтоўка да гэтага політбою.

Адным з недахопаў зьяўляецца невыстарчальная колькасьць літаратуры для гурткоў. Райкому трэба будзе прыняць захады для ліквідацыі гэтага недахопу.

Б. Зайчык.

Аб політмінімуме ня ведаюць

У ячэйцы КСМ саўгасу Весьні (Ашмянскі раён) яшчэ да гэтага часу не прыступілі да правядзеньня політмінімуму. У ячэйцы значная колькасьць навічкоў, але ніводзін з іх не ахоплены політвучобай. Адсюль—слабая ўдзел навічкоў ва ўсёй рабоце ячэйкі і саўгасу.

Райком КСМ не клапаціцца аб тым, каб наладзіць політвучобу, асабліва з навічкамі.

Прыступаючы

Політвучоба ў Глускім раёне правалена

Ня гледзячы на шматлікія пастановы аб політвучобе, аб праведзеньні тэрміну правядзеньня політмінімуму, у Глускай організацыі ўсё яшчэ нічога не зроблена, каб ліквідаваць політнепісьменнасьць сярод комсамольцаў.

У раёне значная частка новаорганізаваных ячэек і значная колькасьць навічкоў. Аднак, ніякай работы, каб ахапіць іх задавальняюча не праводзіцца. Ні адна з новаорганізаваных ячэек не арганізавала політгуртка. Гэта просты вынік таго, што ўсякая работа па замацаваньню новаорганізаваных ячэек і нагул работа з навічкамі не праводзіцца.

Пятрусь Дзех



„Комунараўцы" ў паходзе

Колгас „Комунар", Гарбаціцкага сельсавету, Бушацкага р-ну, організаваўся ў красавіку 1931 году з 14 гаспадарак. Кулакі ўсімі сіламі стараліся разбурыць колгас, распускалі розную хлусьню, страшылі колгасьнікаў і г. д. Але не ўдалося ім гэта. „Комунар" паступова рос і ўмацоўваўся.

Плян на вясновым севу колгас перавыканаў. Лёну засеяў 44,5 га. Ужо зараз „Комунар" складаецца з 113 гаспадарак.

Старшыня колгасу партыец т. Найдунаў організаваў работу ў колгасе па-ўдарнаму, па-бальшавіцку. Ён перад цяжкасьцямі не пасаваў, рук не апускаў, а з бальшавіцкай энэргіяй мобілізаваў колгасныя масы на лепшую організацыю працы і колгаснага жыцьця.

Уборку ўраджаю „Комунар" правёў па-бальшавіцку. Першым прыступіць да ўборкі „Комунар" дэталёва абгаварыў пытаньні ліквідацыі абязлічкі, пераводу ўсіх галін сельска-гаспадарчае працы на зьдзельшчыну.

Усе галіны с-г. вытворчасьці „Комунара" пераведзены на зьдзельшчыну і не формальна, а на справе, поўнасьцю ліквідавана абязьлічка, організаваны правільны ўлік працадзён кожнага колгасьніка. Уся праца праводзіцца комуністычнымі мэтодамі на аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Організаваны чырвоныя і чорныя дошкі, а таксама выяўленьне сапраўдных ударнікаў і лодыраў. Працоўная дысцыпліна ўзьнята на вышыню.

Уборка 44,5 га лёну скончана 18 жніўня. Увесь час працавалі сталыя ўдарныя брыгады з 85 чал., якія спаборнічалі паміж сабою. Выбраны лён тэрмінова быў абіты, вымачаны і разасланы. „Комунар" па ўборцы тэхнічных культур, збожжа і сена аказаўся першым у Гарбаціцкім сельсавеце.

Згодна пляну, „Комунар" павінен засілосаваць 75 тон. Да 19 жніўня „Комунар" засілосаваў ужо 65 тон зялёных кармоў. Звыш пляну ў верасьні месяцы „Комунар" абавязаўся закласьці 120 тон сілосу.

Да асеньняга севу „Комунар" падрыхтаваўся сваячасова і 28 жніўня вышаў на сяўбу.

Зараз колгас разьбіты на паасобныя аддзяленьні. Паміж аддзяленьнямі складзены соцумовы.

Комсамольская ячэйка колгасу „Комунар" павінна зараз-жа перабудаваць сваю работу, прыстасаваўшы яе да задач, якія стаяць перад колгасам, перанесьці сваю работу ў аддзяленьні, брыгады наладзіць сталае кіраўніцтва і штодзённую масавую работу сярод моладзі.

Бальшавіцкая праца і барацьба „Комунар" павінны стаць лепшым прыкладам працы па-новаму для ўсіх колгасаў Бушацкага р-ну.

Вузьдзенскі райком ігнаруе політвучобу

Вузьдзенская комсамольская організацыя за апошні час значна ўзрасла, але сярод новапрынятых не вядзецца ніякай работы. Навічкі не ахоплены політвучобай.

Наогул у раёне дрэнна наладжана політвучоба. З 30 ячэек толькі некаторыя займаюцца сыстэматычнай вучобай. У райкоме КСМ яшчэ дагэтуль не наладжан вучот політнепісьменных раёну. Райком КСМ дрэнна кіруе політвучобай. Нарады кіраўнікоў ні разу не скліканіся, не працуюць гурткі мэтадычнай дапамогі. Партыйныя ячэйкі не дапамагаюць комсамольскім у гэтай справе.

На ўсёй організацыі раскаўюджана шкодная думка аб немагчымасьці займацца політвучобаю ў час уборачнай кампаніі. Гэтую насср эа опортуністычную думку падтрымліваюць і ў райкоме.

Райкому КСМ трэба зараз-жа перабудаваць сваю работу так, каб даць ячэйкам кіраўніцтва і дапамогу ў наладжваньні політвучобы шляхам перанясеньня яе ў брыгаду на поле і конкрэтнай увязкі з практычнай работай.

Комсамолец

Ад штабу па збору папяровай макулатуры

15 верасьня—усебеларускі паход

Транспорт павінен забясьпечыць перавозку макулатуры

Пазаўчора адбылося чарговае паседжаньне створанага пры газэце „Чырвоная Зьмена“ штабу па збору папяровай макулатуры.

Штаб заслухаў інформацыю прадстаўнікоў Белутылю, ЦБ ДКА, Саюзпаперы, Саміпрамсаюзу і Белмалжывёлсаюзу аб праробленай імі рабоце па разгортваньню і збору папяровай макулатуры і падрыхтоўцы да ўсебеларускага паходу.

Улічваючы, што піонэрарганізацыя Менску ў асноўным падрыхтавана да правядзеньня 15 верасьня суботніка, штаб пастанавіў правесьці ў Менску збор папяровай макулатуры 15-га, а ў астатніх гарадох і раёнах на працягу 5 дзён, пачынаючы з 15 па 20 верасьня.

Даручана прадстаўніку Белутылю падрыхтаваць зборныя пункты да сустрэчы ўтылю. Адначасова з гэтым даручана прадстаўніком усіх арганізацый забясьпечыць па сваёй лініі актыўны ўдзел у правядзеньні суботніка.

Усе раённыя комсамольскія арганізацыі павінны неадкладна інфармаваць штаб аб тым, якая праведзена работа на падрыхтоўцы паходу, ці створаны штаб, як работа разгорнута.

Улічваючы, што тэмпы збору папяровай макулатуры недастатковы, а таксама дрэнна працуе транспорт, штаб пастанавіў зьвярнуцца да ўпаўнаважанага Наркомшляху з хадайніцтвам прадставіць неабходную колькасьць вагонаў для перавозкі макулатуры. Справа ў тым, што ў Гомелі запас макулатуры складае каля 30 вагонаў. таксама ў Менску звыш 3-х вагонаў. У гэты час папяровыя фабрыкі працуюць без патрэбнай нагрузкі, а шклоўская фабрыка „Спартак“ надоечы стаяла 24 гадзіны.

Збор папяровай макулатуры і перавозка яе застаецца на сёньнешні дзень у пагражаючым стане. Штаб зьвяртаецца да ўпаўнаважанага Наркомшляхаў і да комсамоліі чыгункі, якія павінны забясьпечыць працу папяровых фабрык, прадставіўшы магчымасьць перавезьці сабраную макулату.


Штаб зьвяртаецца да ўсіх раённых комсамольскіх арганізацый з настойлівым патрабаваньнем: у бліжэйшыя дні павінны быць створаны раённыя штабы. Неабходна наладзіць сталае опэрацыйнае кіраўніцтва раённых штабаў працай комсамоліі фабрык, заводаў, колгасаў і саўгасаў.

15-га верасьня — усебеларускі паход за папяровай макулатурай!

12-га верасьня—чарговае кантрольнае паседжаньне штабу. Да гэтага паседжаньня ўсе організацыі павінны падрыхтаваць матар'ялы аб сваёй рабоце па падрыхтоўцы да паходу і ўсёй работы, якая разгорнута ў гэтым напрамку.

Штаб чакае зьвестак ад раённых організацый.

Штаб.



Больш макулатуры,—больш паперы!

Насустрач патоку асеньня-зімовых грузаў

Перашкодай стаў процант хворых паравозаў

Кінуць рацыяналізатарскую думку на барацьбу за мэханізаваны транспорт і здаровы паравозны парк

Чыгуначны транспорт усіх раёнаў Беларусі да асеньня-зімовых перавозак яшчэ не гатоў. Тэмпы работы як гаспадарчых, так і профсаюзных организацый не забясьпечваюць выкананьня пастаўленых перад транспортам важнейшых задач, у галіне асеньня-зімовых перавозак.

Спэцыяльны аздароўчы рамонт паравозаў паасобных раёнаў к вызначанаму тэрміну ня выкананы, асабліва ў Віцебску, дзе на 15-VIII г. г. заставалася 34 паравозы. За апошнія дэкады процант хворых паравозаў расьце. Напрыклад: у Жлобіне 3-я дэкада ліпеня дала 18,79 проц., 1-я дэкада жніўня—19,49 проц., пры норме 16 проц.; у Гомелі (у такім-жа парадку)—18,7 проц., 19,5 проц. пры заданьні 18,04 проц.; у Віцебску—22,6 проц., 23,22 проц. пры заданьні 18,3 проц.; у Воршы—16,1 проц., 17,3 проц. пры заданьні 13,2 проц.

Масавы зрыў спаранай язды наглядаецца па ўсіх раёнах. Важнейшыя эксплёатацыйныя вымернікі (сярэдня-сутачны прабег рабочага вагона, зварот вагонаў, прастой вагонаў і інш.) ня выконваюцца.

Усё часьцей бываюць выпадкі адцэпкі вагонаў па гарэньню і тэхнічнай няспраўнасьці.

Плян рамонту пуцей і будаўніцтва новых, выкананы ад 20 да 50 проц. Плян грамадзянскіх пабудоў у значнай частцы сарваны (Магілеў, Жлобін). Профорганізацыі і гаспадарчыя органы, не праяўляюць конкрэтнага опэрацыйнага кіраўніцтва, як у раёне, так і на мясцох формальна адносяцца да перабудовы работы па-новаму, цэнтр цяжару не перанесен у нізавыя зьвеньні, цэх, брыгаду, групу.

Асеньня-зімовых не прадугледзелі

Жлобін. У параўнаньні з мінулым, стан паравознага парку Жлобінскага вузла зараз палепшыўся. Пасобныя паравозныя брыгады, маюць разьлівы дасягненьні паспяхова пераходзяць на гаспадарчы разрахунак. Есьць, аднак і цэлы рад прарываў, які ў час асеньня-зімовых перавозак будуць тармазіць бесьперабойнае абслугоўваньне вузла-паравозаў.

Графік стаўкі паравозаў пад прамыўку на Жлобінскім вузьле існуе толькі для паказу, на справе яго не прытрымліваюцца. Вельмі часта на прамыўку зьбіраецца адразу па 4-5 паравозаў, дзеля прастой паравозаў перавышае норму (50-60 гадзін, замест 44 у халоднай прамыўцы. 20-25 гадзін, замест 16 у гарачай).

Гарачая прамыўка праводзіцца без тэхнічнага кіраўніцтва. Начальнік дэпо заўлае, што старшы прамывальшчык па штату не палажаны. Абавязкі ў гэтай працы правадзіць да таго, што пасьля прамыўкі начыняюць цэлы трубы і разьвіхадзіцца шыны, паравоз ідзе ў рамонт.

Адміністрацыя дэпо здымае прычыну прарываў недахопам рабочае сілы. Між тым механізацыя работ не праводзіцца. Ужо даўно складзены каштарыс на электрыфікацыю дэмратаў Бэккера, адпушчаны сродкі, застаецца толькі прыступіць да гэтай працы.

Але... Прараб Дзімітрыяў спасылаецца на тое, што ён новы чалавек, нядаўна заступіў на гэту працу, прычым каштарыс знаходзіцца ў сундучку тэхніка, які паехаў на раён, а таму ён, Дзьмітрыяў да працы прыступіць ня можа.

Ужо паўгода як узгадняецца пытаньне аб пабудове апускной канавы для падачы скатаў пад абточку без пад'ёмкі паравоза. Але-ж гэты плян ляжыць без руху ў портфэлі прораба Межжынскага.

Выцяжныя трубы не рамантуюцца. Пры ўезьдзе паравоза ў дэпо адразу напаўняецца дымам. 25 і 27 жніўня рабочым прышлося на некалькі гадзін прыпыніць працу дэпо і выходзіць на двор.

Усе варштаты патрабуюць рамонту, але толькі адзін адпраўлены на завод. Адсутнасьць амэрыканскіх патронаў выклікае дарэмную трату часу для ўстаноўкі, але ніхто не падумаў іх здабыць.

Да гэтага часу ня ўжываецца нізкавольтнае асьвятленьне, хаця ўсё неабходнае ёсьць. Рабочыя-ж па старынцы працуюць з капцілкамі.

Паравозны парк не забясьпечаны запаснымі часткамі. Аддзел цягі склаў на іх заяўкі 10 ліпеня г. г. і перадаў дапры, заяўкі праляжалі ў аддзеле НХ без усялякага руху да 20-га ліпеня нарэшце былі зьвернуты ў аддзел цягі для расцэнкі. З-за таго, што аддзел цягі расцэнак на запасныя часткі не мае, заяўкі зноў накіраваны ў НХ 12-га жніўня. Такім чынам па віне бюрократаў і валакітчыкаў састаў да асеньня-зімовых перавозак не забясьпечаны запаснымі часткамі для рамонту паравозаў.

Рабочая сіла дэпо скарыстоўваецца не рацыянальна. Найчэка паравозаў у большасьці выткарацца кваліфікаванай рабочай сілай. Сьлесарам вельмі часта даводзіцца пераносіць часткі з цэху ў цэх, бо ім да гэтага часу не даюць чорнарабочых.

Ужо зараз не хапае паравозных брыгад. Ніхто яшчэ не займаецца пытаньнем перакваліфікацыі рабочых, ня створаны курсы на падрыхтоўцы для новых брыгад.

Яшчэ ў маі месяцы мінулага году рабочы Сатыка ўнёс прапанову пракладзіць дарогу для падачы скатаў у дэпо. Гэта мерапрыемства павінна было вызваліць шмат рабочае сілы і зэканоміць сотні рабочых гадзін, аднак у жыцьцё яно не праведзена.

БЕЛТА

За шматмільённы комсамол—за многатысячную „Чырвонку“

Пакласьці канец опортуністычнай бязьдзейнасьці Барысаўскай, Лепельскай і Дрысенскай комсамольскай організацыі ў справе распаўсюджваньня „Чырвонай Зьмены“

IX зьезд УсеЛКСМ ужо больш як 7 месяцаў назад вынес рашэньне форсаваць тэмпы росту комсамолу. Комсамол за гэты час у галіне росту дабіўся вялікіх посьпехаў. Беларуская комсамольская організацыя вырасла за 85 тысяч новых членаў. Замацаваньне навічкоў патрабуе шырока разгорнутай масавай работы з газэтай, кнігай.

Барацьба за чытаемасьць „Чырвонай Зьмены“ за ўменьне працаваць з газэтай—адно з мерапрыемстваў замацаваньня новых членаў КСМ.

Рад комсамольскіх організацый Барысаўшчыны, Лепельшчыны, Дрысеншчыны недапушчальна опортуністычна адносіцца да прасоўваньня „Чырвонай Зьмены“ ў гушчы навічкоў-комсамольцаў.

Тыраж „Чырвонай Зьмены“ ў бліжэйшыя месяцы павінен быць даведзены да лічбы членаў КСМ. Опортуністычнай недаацэнцы прасоўваньня „Чырвонай Зьмены“ павінен быць пакладзены канец. За гэта павінны змагацца ўсе комсамольскія організацыі. Гэта наша задача.

„Чырвонку“—у масы

За апошні час рад комсамольскіх організацый значна паслабіў барацьбу за распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“. Дрысенская комсамольская організацыя налічвае больш 1.300 комсамольцаў, а „Чырвоная Зьмена“ выпісваецца каля 300 нумароў. Такі нізкі процант выпіскі „Чырвонкі“ гаворыць аб тым, што раённая комсамольская організацыя не займалася справай распаўсюджваньня газэты, падняцьця яе тыража і палепшаньня чытаемасьці.

Рад комсамольскіх ячэек „Чырвонай Зьмены“ альбо зусім ня выпісвае, альбо ў такой малой колькасьці, што яе чытаюць адзін ці два чалавекі.

Комсамольская ячэйка колгасу Будзёнага на 12 чал. выпісвае 2 экз. „Чырвонкі“. Комсамольская ячэйка комуны „Новы сьвет“ на 22 комсамольцы выпісвае 6 экз., але амаль усе нумары газэты кладуцца на шафу і іх па пяць-шэсьць дзён ніхто ня чытае.

Газэта адыгрывае вялікую ролю ў справе ўвядзеньня ў курс жыцьця комсамолу—навічкоў у падняцьці іх політузроўню, у організацыі іх вакол генэральнай лініі партыі. Аднак, пераважная большасьць навічкоў газэты ня чытае. Большасьць комсамольцаў ня ведаюць, як працаваць з газэтай.

Райком комсамолу Дрысеншчыны павінен забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК ЛКСМБ аб тым, што кожны комсамолец павінен выпісваць і чытаць сваю газэту. Гэта дапаможа організацыі ўзьняць політузровень навічкоў, замацаваць іх і ўцягнуць у працу, дапаможа комсамольскім ячэйкам сапраўды па-бальшавіцку, опэрацыйна кіраваць работай у барацьбе за генэральную лінію партыі і правядзеньні ў жыцьцё рашэньняў IX зьезду УсеЛКСМ і кантрольных пленумаў ЦК.

Казлоў.

Ліквідаваць прарыў

Яваўская ячэйка ЛКСМБ Карменскага р-ну ня выконвае задач, пастаўленых X усебеларускім зьездам КСМ аб тым, каб комсамольцы выпісвалі і чыталі сваю газэту „Чырвоная Зьмена“. У Яваўскай ячэйцы каля 20 комсамольцаў, а выпісваюць „Чырвоную Зьмену“ толькі трое, „Комсамольскую Праўду“—чацьвёра.

А сярод беспартыйнай моладзі ня знойдзеш ніводнага падпісчыка на „Ч. З.“ Зараз абраны новы ўпаўнаважаны па падпісцы на газэты, але прарыў яшчэ не ліквідаваны.

Юнкор Герасіменка

Карсакаўцы ня чытаюць газэту

Распаўсюджваньне газэты „Чырвоная Зьмена“ ў Карсакавіцкім сельсавеце Барысаўскага р-ну праходзіць як ніколі дрэнна. Замест павышэньня ў некалькі раз тыраж зьнізіўся зусім. Па ўсім сельсавеце выпісваецца адзін нумар „Чырвонай Зьмены“. А комсамольцаў у с.-савеце шмат, беспартыйнай моладзі яшчэ больш.

Зрыву падпіскі на „Чырвоную Зьмену“ дапамагае і пошта, якая вельмі дрэнна дастаўляе газэты. Карсакавіцкі сельсавет няпрымае захадаў, каб наладзіць сталую дастаўку газэт.

Капыток

50 чалавек і адна „Чырвонка“

У Каменскай ячэйцы 4-й дыстанцыі будаўніцтва дарогі, амаль зусім ня выпісваецца „Чырвоная Зьмена“. На 50 чалавек комсамольцаў „Чырвоную Зьмену“ выпісвае адзін сэкратар ячэйкі. На будаўніцтве дарогі шмат рабочай моладзі, а культурна-выхаваўчай работы сярод яе не вядзецца. Газэты ня выпісваюцца і ня чытаюцца. Бюро ячэйкі павінна зламаць сваю бязьдзейнасьць і дабіцца, каб кожны комсамолец выпісваў і чытаў „Чырвоную Зьмену“.

РК ЛКСМБ Лепельшчыны таксама павінен пакінуць сьпячку і па-баявому ўзяцца за распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“ сярод комсамольцаў.

Зьм. Кузьменка

Рост на тармазох

Бюро комсамольскага колектыву колгасу „1-га мая“ (Прыгарадны сельсавет, Віцебск) яшчэ не ўзялося за выкананьне рашэньняў пленуму ЦК УсеЛКСМ аб росьце.

За ўвесь час ня прынята ніводнага чалавека ў ячэйкі „1-е мая“ Моханева і інш. Нядбайна адносяцца да афармленьня прыёму ў комсамол. Член гаркому т. Латышова згубіла 14 анкет. Гарком КСМ павінен жорстка ўдарыць па тых, хто тармозіць выкананьне пастаноў X і IX зьездаў КСМ.

Юнкор Анатолі Вішнёвы.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Дом навукі і тэхнікі

(Былы Дом Комсамолу) апавяшчае, што бібліотэка пачынае працаваць з 10-га верасьня 1931-г. і адчынена што дзённа ад 6-ці да 10-ці гадзін увечары.

Праводзіцца перарэгістрацыя чытачоў. Просьба да ўсіх чытачоў зьвярнуць узятыя раней кнігі.

СЁНЬНЯ а 6-й гадзіне ў памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі адбудзецца агульна-гарадзкая нарада актыву КСМ, на якой павінны быць сэкратары комсамольскіх колектываў, цэхавых ячэек, члены бюро.

Нарада склікаецца па пытаньню:

Аб падрыхтоўцы КСМ організацыі да манэўраў.

Заг. орг. аддз. Менгаркому ЛКСМБ КАНОПІК.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599